# УСЯКАЯ ІНТЭРВЕНЦЫЯ—БЕЗЗАКОННЕ

## *Выступленне кіраўніка дэлегацыі Беларускай ССР К. В. КІСЯЛЁВА у Палітычным камітэце Генеральнай Асамблеі ААН*

*8 снежня 1965 года*

Палітычны камітэт абмяркоўвае цяпер надзвычай важнае і тэрміновае пытанне «Аб недапушчальнасці ўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржаў, аб абароне іх незалежнасці і суверэнітэту», уключанае ў парадак дня гэтай сесіі Генеральнай Асамблеі па ініцыятыве ўрада Савецкага Саюза. Як, напэўна, добра памятаюць дэлегаты, гэта пытанне было прадстаўлена пленуму Асамблеі міністрам замежных спраў Саюза ССР А. А. Грамыкам у яго выступленні яшчэ ў самым пачатку нашай работы. Напэўна, добра памятаюць і тое, што ініцыятыва Савецкага Саюза атрымала шырокае прызнанне і падтрымку з боку цэлага раду дэлегацый, якія расцанілі гэту ініцыятыву як новы доказ міралюбівых імкненняў СССР, як праяўленне яго шчырай заклапочанасці карэннымі праблемамі чалавецтва.

Дэлегацыя Беларускай ССР, са свайго боку, лічыць, што савецкая прапанова ўзнімае адно з асноўных, прынцыповых пытанняў міжнароднага жыцця. Сапраўды, небяспека для ўсеагульнага міру ўзнікала і ўзнікае кожны раз, калі адны дзяржавы ўмешваюцца ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў, і асабліва, калі гэта ўмяшанне ажыццяўляецца з дапамогай узброеных сіл.

падпісаным воляй пераважнай большасці чалавецтва.

Тым не менш трэба з усёй сілай падкрэсліць, што ЗША працягваюць гэту злачынную палітыку. Па-ранейшаму не праяўляецца гатоўнасці да перагавораў на справядлівай аснове, прапанаванай Нацыянальным фронтам вызвалення Паўднёвага В'етнама і ўрадам ДРВ. Больш таго, прадстаўнікі ЗША ў ААН пастаянна спрабуюць абяліць дзеянні сваіх правячых колаў, зняць з іх адказнасць за расшыраемую «брудную вайну» ў В'етнаме. Пры гэтым, вядома, робяцца нязграбныя спробы зваліць віну, як гаворыцца, з хворай галавы на здаровую. Але гэта ім не ўдаецца і ніколі не ўдасца.

Відавочна, што марыянетачны рэжым у Сайгоне не мае па-сутнасці ніякай сацыяльнай апоры сярод насельніцтва краіны, усе свае надзеі ён ускладае на амерыканскія войскі. Перад наяўнасцю растучага нездавальнення самых розных слаёў паўднёвав'етнамскага народа сайгонская марыянетачная зграя і амерыканскія войскі звяртаюцца да жорсткіх рэпрэсій з мэтай падаўлення ўсенароднага імкнення да незалежнасці, дэ-

В'етнама за незалежнасць, мір, дэмакратыю і нацыянальнае ўз'яднанне. Мы лічым, што адзіны шлях вырашэння паўднёвав'етнамскага пытання заключаецца ў тым, каб ЗША выканалі, нарэшце, Жэнеўскія пагадненні, неадкладна спынілі бамбардзіроўкі, убралі з Паўднёвага В'етнама свае войскі, вывезлі ўзбраенне, спынілі ўсякае ўмяшанне ў справы Паўднёвага В'етнама, далі паўднёвав'етнамскаму народу права самому вырашаць свае ўнутраныя справы.

Наша дэлегацыя перакананa, што неабходна як мага хутчэй пакласці канец агрэсіі, і не толькі ў шматпакутным В'етнаме, які мужна адстойвае свае суверэнныя правы на працягу многіх гадоў, а таксама ў іншых раёнах, дзе мелі або ўсё яшчэ маюць месца акты ўмяшання, накіраваныя на падрыў свабоды і незалежнасці суверэнных дзяржаў.

Дазвольце прывесці яшчэ адзін прыклад. Як вядома, у красавіку г. г. народныя масы Дамініканскай Рэспублікі на чале з палкоўнікам Кааманьо ўзяліся за зброю, каб звергнуць марыячетку Злучаных Штатаў. Народ патрабаваў аднаўлення канстытуцыі 1963 года. Паў-

Дэлегацыя Беларускай ССР лічыць, што палітыка ўмяшання з'яўляецца асабліва небяспечнай для тых дзяржаў, якія параўнальна нядаўна дабіліся незалежнасці ва ўпартай барацьбе з каланізатарамі і цяпер напружваюць усе сілы, каб развіць сваю нацыянальную эканоміку і даць для свайго народа перавагі, звязаныя з прагрэсам матэрыяльнай вытворчасці. Практыкуемая палітыка ўмяшання стварае цэлы рад цяжкасцей для гэтых дзяржаў, зацікаўленых у хутчэйшым выкарчоўванні рэшткаў каланіялізму і яго ганебнай дактрыны расавага нераўнапраўя.

Мы непахісна перакананы ў тым, што настаў час аб'яднаць усе міралюбівыя сілы для спынення любых спроб умяшання імперыялістаў ва ўнутраныя справы народаў. Іменна таму дэлегацыя Беларускай ССР выказваецца ў падтрымку прапанаванага Савецкім Саюзам праекта дэкларацыі «Аб недапушчальнасці ўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржаў, аб абароне іх незалежнасці і суверэнітэту», сэнс і прызначэнне якой былі тут так глыбока прааналізаваны прадстаўніком СССР паслом Н. Т. Федарэнкам.

Статут ААН у артыкуле 2 (пункт 4) замацаваў прынцып суверэннай

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы